■ Фотаздымак з гісторыяй

# ПАЛЯВАННЕ Ў ЖЫЦЕ


Пётр Мікуліч (у цэнтры) з саслужыўцамі, 1940 год.

...Заставаліся лічаныя дні да дэмабілізацыі, да вяртання ў сваё роднае мястэчка Смілавічы, калі пачалася вайна. Вучэбна-артылерыйскі полк з ваеннага гарадка, што паблізу Маладзечна, у якім мой дзядзька, старшы сяржант Пётр Мікуліч, быў камандзірам дзвюх 45-метровых гармат, 22 чэрвеня 1941 года рушыў у напрамку дзяржаўнай мяжы, насустрач ворагу. Коні выцягнулі гарматы ў чыстае поле. Мікуліч убачыў наперадзе нізіну, зарослую хмызняком. Усё было ціха, спакойна, толькі чуліся ржанне коней ды скрып колаў. Нішто не нагадвала пра вайну. Ласкава свяціла сонейка, спявалі птушкі, у невысокім жыце красавалі валошкі. Букецік з іх падарыла яму каханая, праводзячы ў армію...

Вайна... Якая вайна? Слухаючы птушак, цяжка было ў гэта паверыць. Здавалася, полк накіроўваецца на чарговыя вучэнні. Толькі некалькі дзён назад слухалі заяву ТАСС, выступаў Молатаў. Запэўнівалі, што ніякай вайны не чакаецца, а чуткі пра вайну — правакацыя. Шмат камандзіраў было адпраўлена ў водпуск...

Раптам з хмызняку затрашчалі кулямётныя чэргі. Хто ж думаў, што там, заглушыўшы матооры, прытаіліся нямецкія танкі?

Людзі з пяхотнай калоны, якая рухалася той жа дарогай, пачалі валіцца, як снапы. Стогны, лямант. Ні дрэўца, ні кусціка, ні канаўкі, каб укрыцца... Два разлікі Мікуліча з «саракапяткамі» аказаліся перад браніраванымі машынамі гітлераўцаў як на далоні. Адзін з разлікаў адразу быў зрэзаны, нібы касой. Конь паваліўся, пачаў біць капытамі і хрыпець, з яго шыі струменьчыкам біла кроў... Усё гэта Пётр убачыў бакавым зрокам, ліхаманкава, разам з іншымі адчэпліваючы ад передка двухколкі гармату, разварочваючы яе. Ускінуўшы да вачэй бінокль, убачыў адзін з танкаў, які з-за куста вёў бесперапынны агонь. Усё адбылося хутка, нязвыкла, нават думка не прыходзіла ў галаву, што яго таксама можа зрэзаць чарга. Таму стаяў не прыгінаючыся, у поўны рост. Раптам адчуў, як моцна запякло ў назе і плячы.

Што тварылася вакол, ён не ведаў. Усю ўвагу скіраваў на «свой» танк. Першы снарад «саракапяткі» разарваўся ззаду браніраванай нямецкай машыны, потым — спераду... Цэль вось-вось будзе накрыта. Але зараўлі ў ляску танкавыя маторы. Стальныя страшыдлы, ведучы беглы агонь і манеўруючы, рынуліся на паходную калону. Было сапраўднае пекла: звон, свіст, скрыгат, ржанне смяротна параненых коней, крыкі людзей. Аднекуль ляцелі камякі зямлі. Едкі смурод слаўся над полем. Паспелі зрабіць толькі некалькі выстралаў, як адзін з танкаў аказаўся побач і раздушыў гармату. Кінуўшыся ў жыта, Пётр паспеў заўважыць, як з люка выскачыў немец і выстраліў з пісталета некалькі разоў у галаву зараджаючаму — высокаму прыгожаму масквічу Хрэсіну.

Заўважыўшы параненага Пятра, які, кульгаючы, бег да жыта, нямецкі танкіст апусціўся ў люк і накіраваў машыну следам. Пётр ужо дабег да жыта, але ў гэты момант жалезная грамадзіна навісла над ім, пагражаючы раздушыць. Інстынктыўна, ён упаў паміж гусеніц. Ад днішча танка дыхнула жарам, нібы з печы, жалезная гара з лязгам прасунулася над ім. Жывы! Але гітлеравец развярнуў машыну і зноў кінуў яе на чалавека. Пётр зноў распластаўся паміж гусеніц. Так паўтаралася шмат разоў. «Госпадзі, змілуйся...» — шаптаў ён. Адкуль толькі браліся сілы для сапернiцтва з маторам! Раненая нага распухла, ліпкая кроў напоўніла бот, лопнула халява, агнём гарэла плячо, а Пётр зноў і зноў адбягаў ад танка і кідаўся паміж гусеніц. Едкі танкавы дым і пот раз'ядалі вочы, ад страты крыві наступала млявасць, а немец забаўляўся, як кот з мышшу. Але для Пятра цаной гэтай «гульні» было жыццё...

Губляючы прытомнасць ад страты крыві, Пётр нейкім цудам умудрыўся ў апошні момант адсунуцца ад гатовай вось-вось расплюшчыць яго гусеніцы. Якую ж садысцкую радасць (ці злосць?) адчуваў у гэты момант танкіст, палюючы на беспаможнага чалавека!

Вечарэла. Набліжалася хвіліна, калі павінна было ўсё скончыцца... Калі немец зразумеў, што занадта ён захапіўся паляваннем на чалавека, наступіла расплата: з лесу па танку ўдарылі нашы гарматы.

Перад тым, як праваліцца ў цемру непрытомнасці, Пётр убачыў, як успыхнуў ненавісны танк. На полі бою яго падабралі нашы санітары.

**Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,**
*г. Мінск*

*Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры) дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны прызам. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.*

■ Успамін дзяцінства



# КАНАПУШКІ НА КРЫЛАХ

**Вясна для нас, сельскіх дзяцей, асацыіравалася з прылётам птушак, асабліва ластавак. Яны з года ў год ляпілі з гліны пад маціцай у хляве свае гнёзды. Як толькі з'яўлялася траўка на лузе, карову выганялі на пашу і хлеў цэлы дзень стаяў адчынены. Птушачкі снавалі туды-сюды. Некаторыя «рамантавалі» сваё ранейшае гняздо, якое за зіму пахінулася, іншыя, пэўна, радня, побач ляпілі новыя. Мы, дзеці, любаваліся іх няспыннай працай.**

Як стала я падрастаць, то на носе і шчочках з'явіліся канапушкі. Мне гэта не падабалася. Пытаюся ў сваёй цёці Амілі: «Адкуль яны ўзяліся, гэтыя непатрэбныя цёмныя плямкі?»

— Іх прынеслі на крылах ластаўкі, — адказала яна.

Я задумалася: можа, і праўду яна кажа. Зімою ж не было іх. А як вясна прыйшла, і рабаціннe на твары з'явілася. Няўжо любімыя птушкі прынеслі мне шкоду?

— Як мне пазбавіцца ад гэтых канапушак? — зноў я трывожу цёцю. Мне тады было гадоў пяць. Усё прымала за чыстую манету. Тым больш што ў тыя часы не было ніякай касметыкі.

— Дам табе такую параду. Яшчэ не з'явіліся ластаўкі. Яны прыляцяць, як цёпла стане і мошкі розныя з'явяцца, каб было чым сілкавацца. Калі ты першую птушачку заўважыш, то, дзе стаіш і што будзе на тым месцы пад рукой, тым і памаж тварык, — адказала цёця.

— А калі нічога не будзе? — дапытваюся.

— Тады хоць гразззю натры тварык.

Усталявалася цёплае веснавое надвор'е. Прыляцелі з выраю амаль усе птушкі. Прыглядаюся, каб хутчэй пабачыць ластавак. І вось стаю каля хаты, а мне ледзь не пад ногі адна прашмыгнула. Што рабіць? Нічога ж побач няма. Прыгадала цётчыну параду: узяла тут жа жменьку гліны і давай ёй твар мазаць. Ну, не інaчай, як маленькае чарцяня атрымалася. Стаю, чакаю. Хутка гліна стала падсыхаць і адвальвацца. «Ну, — думаю, — адваліцца з ёй і рабацінне». Як заўважыла такі цуд маці, спужалася, што гэта са мной сталася, і павяла мяне наўпрост да студні, каб прамыць твар...

З узростам рабацінне знікла само, у нейкай ступені і касметыка дапамагла. Мінула з таго часу шмат гадоў. А з прылётам ластавак кожны раз прыгадваю той выпадак. Якое ж было бяскрыўднае, наіўнае, цікавае, цудоўнае дзяцінства.

**Кацярына СОСНА,**
*г.п. Шаркаўшчына*



# ЦЯГНІК ЗАБАЎ

(для малечы)

Лабірынт



3D малюнак



Знайдзіце 10 адрозненняў




Загадка

**Красавала, чырванела**
**кветачка на градках.**
**Як пялёсткі абляцелі —**
**засталася хатка.**
**Патрасеш — яна звініць.**
**Хто ў хаціне той**
**сядзіць?**
**Булкам адмысловы**
**смак**
**надае звычайны...**

(Мак) [адказ надрукаваны дагары нагамі]

Вядучая рубрыкі Алена БІЗУНКОВА.